# *САБРАНЫЯ У ІМЯ ХРЫСТА НА ШЛЯХУ ДА СВЯТАСЦІ*

## падручнік для пілатаванай пары

Equipes Notre-Dame

## *Дарагія сужэнцы!*

Радуемся, што вы зацікавіліся рухам сужэнскай духоўнасці Equipes Notre-Dame (Суполкі Маці Божай). Для нас гэта значыць, што ваша сужэнства важнае для вас і што вы прагнеце падтрымліваць і развіваць вашу любоў, а таксама будаваць сваё супольнае жыццё на хрысціянскіх каштоўнасцях. Гэта прыгожае жаданне, але адначасова складанае для рэалізацыі ў сучасным свеце. Рух END хоча дапамагчы вам адкрыць, што сужэнства, благаслаўлёнае Богам – гэта шлях да любові, шчасця і святасці. Наш падручнік створаны, каб паказаць сродкі і спосабы, якія прапануе рух END, каб адкрыць гэты шлях і крочыць ім.

У пазнаванні нашага Руху, яго харызмату і педагогікі дапаможа вам сужэнства, якое называецца пілатуючай парай, яно з дапамогай Святога Духа будзе суправаджаць вас на гэтым шляху.

Няхай тэксты, дадзеныя ў гэтым падручніку, служаць вам арыентырамі. Перад усім шукайце аднак вашага асабістага і сужэнскага росту. Старайцеся слухаць Святога Духа, Які жыве ў вас. Ён ёсць у вас, Ён ёсць у вашай любові. Дазвольце Яму весці вас у Хрысце да Бога Айца. Будзьце ўпэўнены ў братэрскай і духоўнай еднасці ўсіх сужэнстваў руху END у Беларусі і ў свеце.

*Адказная Экіпа*

*Супер Рэгіёну Польшча – Цэнтральная Еўропа*

# *СУСТРЭЧА 1*

# *СТВАРЫЦЬ СУПОЛКУ – СУСТРЭЦЬ ХРЫСТА*

---

Сярод пар, сабраных у адным пакоі, ёсць моцная прысутнасць Уваскрослага Хрыста, жывога, уважлівага да кожнага. Хрыста, Які любіць кожнага чалавека такім, які ён ёсць, з яго недахопамі і залежнасцямі. Хрыста, Які спяшаецца дапамагчы нам стаць людзьмі паводле Яго плану.

Ён прысутны так, як вечарам у дзень Пасхі ў Вячэрніку ў Ерузалеме, калі раптоўна з'явіўся перад іншымі членамі грамады: Апосталамі.

Кс. Анры Кафарэль

---

## 1. Уводзіны

Мы група сужэнстваў, падтрыманых прысутнасцю святара. Мы ствараем суполку, гэта значыць, што мы будзем праз падтрымку адзін аднаго разам ісці да чалавечай і хрысціянскай паўнаты кожнага з нашых сужэнстваў. Мы сустракаемся як сакрамэнтальныя сужэнствы, якія ад дня шлюбу даверылі сваё жыццё Богу. Мы будзем адкрываць дзеянне ласкі ў нашым жыцці. Імкнучыся да гэтай мэты, не без цяжкасцяў, мы будуем свет і Касцёл, паколькі і свет, і Касцёл патрабуюць моцных і любячых сужэнцаў.

## 2. Пошукі

Наша мэта ўзнёслая, але гэта памкненне самога Хрыста, які наказаў нам: *«Любіце адзін аднаго, як Я палюбіў вас»* (Ян 15, 12).

Не дасягнем гэтай мэты хутка, але Ён будзе вызначаць кірунак і надасць сэнс нашаму жыццю. Гэта мэта кожнага сужэнства і ўсёй суполкі. Мы ўсе розныя. Кожны з нас мае сваю гісторыю, нясе свой багаж досведу, мае свае асаблівасці. Хтосьці мае глыбокую веру, а ў кагосьці наадварот яна толькі расцвітае. Суправаджаюць нас больш ці менш абгрунтаваныя страхі, праблемы, якія яшчэ застаюцца нявырашанымі.

Незалежна ад нашага стартавага пункта, кожны з нас асабіста пакліканы Богам, каб стаць святым. Святасць – гэта заданне кожнага хрысціянскага сужэнства. Гэта складанае заданне і таму варта рэалізоўваць яго супольна з іншымі сужэнствамі. Падтрымліваючы адзін аднаго, вы павінныя стаць святымі сужэнствамі. Вядома, не абыйдзецца без канфліктаў, але трэба вучыцца перамагаць іх так, каб супольнасць была сапраўднай, і каб у ёй панавала сапраўдная хрысціянская еднасць, змацаваная любоўю. Сведчанні многіх сужэнстваў паказваюць, што супольнасць можа быць крыніцай сілы ў імкненні да святасці.

Гэтыя сужэнствы, ведаючы свае слабасці і межы сваіх магчымасцяў, разумеючы, як цяжка, нягледзячы на жаданне, жыць па-хрысціянску ў няверуючым свеце, з верай у сілу братэрскай дапамогі, вырашылі заснаваць суполку.

Карта END

Карта – гэта асноўны дакумент, які акрэслівае харызмат Руху END. Можна яго знайсці на старонцы інтэрнэту END – www.end.of.by. Перад заканчэннем пілатажа кожнае сужэнства, якое жадае ўдзельнічаць у Руху END, павінна прачытаць Карту.

**3. Шчырыя інтэнцыі**

Мы вырашылі сустракацца па самых розных прычынах. Для таго, каб сустрэць іншыя сужэнствы, каб навучыцца па-іншаму ўспрымаць нашу сужэнскую і сямейную рэчаіснасць, каб з дапамогай іншых сужэнстваў зразумець свет, які вакол нас, каб прымаць удзел у рэлігійным руху. Прычынамі, чаму мы вырашылі ўдзельнічаць у гэтай сустрэчы, мы падзелімся у наступнай частцы сустрэчы.

Пачатковыя мэты хоць і важныя, аднак не вельмі істотныя. Важней за ўсё, каб мы ўсвядомілі, што мы збіраемся ў імя Хрыста: мы Ім запрошаныя і вакол Яго сабраліся. Наша вера дае нам упэўненасць, што Ён ёсць тут сярод нас. Сімвал прысутнасці Хрыста на кожнай сустрэчы – гэта запаленая свечка. Мы ажываем у імкненні да лепшага пазнання Бога. Мы вельмі хочам лепш служыць Яму і мацней любіць Яго. Для Бога мы ствараем гэтую суполку.

**4. Сустрэча суполкі**

Суполка будзе сустракацца раз у месяц. У дзень, які вызначаць усе сужэнствы і духоўны дарадчык. Важна, каб пасля вызначэння даты сустрэчы, мы яе не змянялі і каб успрымалі нашу сустрэчу, як адну з самых важных падзей месяца. Важна, каб нашы ўласныя планы мы падладжвалі пад вызначаную дату сустрэчы.

Адмовіцца ад сустрэчы мы можам толькі ў выпадку выключных абставінаў, напрыклад, хваробы. Памятайце, што не толькі вы губляеце магчымасці, калі не прысутнічаеце на сустрэчы. Губляюць таксама ўсе ўдзельнікі, бо вы адбіраеце ў іх сваю прысутнасць, якая для іх з'яўляецца дарам.

На сустрэчу суполкі мы прыходзім абцяжараныя штодзённасцю. Прыходзім удваіх, разам. У нашых сэрцах прыносім нашых дзяцей, нашыя сем'і, сяброў, усю рэчаіснасць нашага жыцця. Збіраемся, каб сустрэць іншыя сужэнствы. Святар спадарожнічае нам на ўзор Хрыста, які быў з вучнямі па дарозе да Эмаус. Чынім гэта ў імя Госпада, у імя Хрыста, які прысутнічае на нашай сустрэчы: ***«Бо, дзе двое ці трое сабраліся ў імя Маё, там Я ёсць сярод іх»*** (Мц 18, 20).

Сустрэча не павінна доўжыцца больш за тры гадзіны.

Яна падзелена на наступныя часткі: абмен жыццёвымі падзеямі падчас супольнага пасілку, супольная малітва, абмен духоўным жыццём і паглыбленне веры і любові, абапірыючыся на фармацыйныя тэмы. Так выглядаюць сустрэчы сужэнстваў, якія ўжо з'яўляюцца ўдзельнікамі Руху. На першых пробных

сустрэчах суполкі могуць адбывацца пэўныя змены, якія абгрунтаваныя пачаткам нашых сустрэч.

Падчас пілатажу будзем паступова пазнаваць харызмат Руху END. Разам з узрастаннем супольнасці, сустрэчы будуць станавіцца больш багатымі па зместу і абмену думкамі.



## *І ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

- ***Супольны пасілак***

Сустрэчу распачынаем супольным пасілкам. Гэта выраз нашага братэрства і магчымасць лепш пазнаць усіх удзельнікаў сустрэчы – сужэнствы і духоўнага дарадчыка. Спажыванне пры стале пасілка – ад вякоў важны звычай, які з'яўляецца прыкладам глыбокай узаемнай сувязі паміж суразмоўцамі. Ён уключае элементы літургіі, калі сабраўшыся вакол стала, узнікае жаданне дзяліцца радасцю з тымі, з кім сустрэліся. Такі матыў сустрэчы нагадвае нам апошнюю вячэру, падчас якой Хрыстос ахвяраваў нам сакрамэнт сваёй любові. Карта на тэму пасілку гаворыць нам наступнае:

«*Рэкамендуецца, каб штомесячная сустрэча распачыналася сумесным пасілкам. Кожны раз у доме іншай сям'і (калі гэта магчыма). Людзі не прыдумалі нічога лепшага ад пасілку для паспяховай сустрэчы і будавання адносін: бо ці ж не эўхарыстычны пасілак збірае дзяцей Бога? Дзеі Апосталаў апавядаюць нам пра першых хрысціян, якія «Штодня збіраліся аднадушна ў святыні і, ламаючы дома хлеб, спажывалі ежу ў радасці і прастаце сэрца»* (Дз 2, 46).

- ***Дзяленне жыццём***

Ад наступнай сустрэчы ў І частцы мы будзем дзяліцца нашымі жыццёвымі падзеямі. Што заключае ў сабе выраз «Дзяленне жыццём»? Што значыць дзяліцца жыццём?

Падчас дзялення жыццём кожнае сужэнства распавядае аб найважнейшых здарэннях кожнага месяца. Важнай з'яўляецца атмасфера і спосаб, як мы дзелімся жыццём. Гэта адбываецца пры стале ў атмасферы слухання. Важна не перапыняць асобу, якая прамаўляе. Не каментаваць. Канечне, калі чалавек скончыць гаварыць, можна задаць нейкае пытанне. Дзякуючы раней падрыхтаванаму ў сужэнстве аналізу падзеяў мінулага месяца, можам шчыра дзяліцца як радасцямі нашага жыцця, так і смуткамі. Часам будзем прасіць парадаў, як нам вырашыць нашыя праблемы.

Калі мы дзелімся жыццём, то асаблівым чынам ствараем з нашай групы супольнасць сяброў. Сяброўства трымаецца на супольных перакананнях. Безумоўна, на многія справы ў нас будуць розныя погляды, але нас аб'ядноўвае жаданне наблізіцца да Бога. І таму ўзгадваючы, што мы ёсць вобраз і падабенства Божае, будзем старацца пазнаваць адзін аднаго.

Досвед многіх сужэнстваў, якія ўжо шмат гадоў удзельнічаюць у Руху Equipes Notre-Dame, амаль аднолькавы. Яны з нецярпеннем чакаюць сустрэчу, жадаючы даведацца, што новага адбылося ў сужэнствах суполкі за апошні час. Памятаюць аб іх паміж сустрэчамі.

Абмен думкамі не павінен быць спантанны. Кожнае сужэнства павінна дома падрыхтавацца да гэтай часткі сустрэчы, абдумаць, што сапраўды было важным. Выбар, аб чым мы будзем распавядаць, залежыць ад абодвух сужэнцаў. Часта гэта далікатная справа, бо не аб усім і не ў кожнай кампаніі мы хочам гаварыць, або мы яшчэ не гатовы падзяліцца пэўнымі рэчамі. Супольная падрыхтоўка мае яшчэ адзін важны аспект. Ні муж, ні жонка не хочуць мець нечаканасцяў адзін ад аднаго.

Пажадана, каб вы запісалі сабе па пунктах, чым вы хочаце падзяліцца. Памятайце аб трох рэчах:

- **час, калі мы дзелімся жыццём, павінен быць па-роўну падзелены паміж усімі сужэнствамі, якія прымаюць удзел у сустрэчы,**
- **важна пад час дзялення не маўчаць, бо гэта не спрыяе сяброўскаму кантакту,**
- **самыя важныя, дадераныя нам таямніцы, мы пакідаем паміж сабой; гэтага патрабуе тактоўнасць і павага да іншых людзей, якія даверыліся нам.**

Падрыхтуйцеся ў сужэнстве, каб дзяліцца жыццём. Супольна выберыце дзве ці тры падзеі, якія адбыліся за апошні час і якія вы лічыце найважнейшымі для вашага сужэнства, сям'і. Кожны з вас – і муж, і жонка – павінны прыняць удзел у моманце, калі мы дзелімся жыццём.

Пасля заканчэння гэтай часткі сустрэчы мы збіраем посуд са стала і ўрачыста запальваем свечку, якая сімвалізуе прысутнасць Хрыста.

## *II ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

### *Малітва падчас сустрэчы*

Адна частка сустрэчы суполкі заўсёды прысвячаецца супольнай малітве. Малітва – гэта асноўнае праяўленне пошуку Бога, Яго праслаўлення, даверу Яму свайго жыцця і выражэння ўдзячнасці. Супольная малітва мае асаблівую вартасць, аб чым гаворыць нам Хрыстос: *«Сапраўды таксама кажу вам, што калі двое з вас на зямлі згодна прасілі б аб чым-небудзь, то станецца ім ад Айца Майго, які ў нябёсах. Бо, дзе двое ці трое сабраліся ў імя Маё, там Я ёсць сярод іх»* (Мц 18, 19-20).

Важныя элементы супольнай малітвы – слуханне і разважанне над Словам Божым, якое павінна адбывацца наступным чынам:

- спачатку паслухаем Божае Слова, якое прачытае гаспадар дому (ці святар, духоўны дарадчык);

- захаваем хвіліну маўчання, каб пранікнуцца Божым Словам;
- потым кожны з нас, калі захоча, уголас паразважае над адным, або некалькімі фрагментамі з прачытанага Слова Божага;
- можам ў голас памаліцца словамі (просьбы, падзякі), якія ўзніклі ў нашым сэрцы ў часе чытання фрагменту Божага Слова.

Калі ўзнікне цяжкасць у выражэнні сваіх думак, то прачытайце фрагмент Слова Божага, які для вас найбольш важны. Пасля чытання скажыце: Хвала Пану!

**Першы ліст св. Паўла да Карынцянаў** (1 Кар 12, 12-21; 26-27).

---

Як цела адно, але мае многа членаў, якія, хоць іх шмат, складаюць адно цела, так і Хрыстус. Бо ўсе мы ў адным Духу ахрышчаныя ў адно цела: ці то юдэі, ці то грэкі, ці то нявольнікі, ці то свабодныя, і ўсе напоўненыя адным Духам. Цела – гэта не адзін член, але шмат. Калі скажа нага: «Я не рука, таму не належу да цела», то ці ж яна не належыць да цела? І калі скажа вуха: «Я не вока, таму не належу да цела», то ці ж яно не належыць да цела? Калі ўсё цела – гэта вока, то дзе ж слых? Калі ўсё слых, то дзе нюх? Цяпер жа Бог змясціў члены, кожны паасобку ў целе, як захацеў. А калі б усе былі адным членам, то дзе цела? Цяпер жа членаў шмат, але цела адно. Таму не можа вока сказаць руцэ: «Ты мне не патрэбна!», ці таксама галава – нагам: «Вы мне не патрэбныя!» Таму, калі церпіць адзін член, церпяць з ім усе члены; калі праслаўляецца адзін член, з ім радуюцца ўсе члены. Вы ж – цела Хрыстовае, а паасобку члены».

---

Разважаючы ўголас над Словам Божым, памятайце, што дзелімся тым, што нам Бог сказаў праз гэтае Слова. Таму варта выказвацца ў першай асобе (*я, мне, для мяне…*). Мы не павінны павучаць іншых ці тлумачыць іншым Слова. Выясняць Слова і даваць указанні пакінем святару – духоўнаму дарадчыку.

Напрыканцы супольнай малітвы, калі ўсе жадаючыя падзяліліся Словам Божым, уголас выкажам найважнейшыя **інтэнцыі**, якія хацелі б даверыць Богу. Святар – духоўны дарадчык збірае іх і прапаноўвае малітву, у якой занясём усе гэтыя інтэнцыі да Божага трону.

## *ІІІ ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*



***Духоўнае жыццё. Паглыбленне веры і любові***

У гэтай частцы, дзелячыся сваім досведам, завязаным з імкненнем да святасці, і нашымі роздумамі па дадзенай тэме, будзем фармаваць сябе, г. зн. змяняць сваю ўнутраную паставу, каб быць бліжэй да Бога. Сутнасцю гэтай часткі сустрэчы з'яўляецца ўзаемная дапамога.

Кожнае сужэнства і кожны ўдзельнік сустрэчы праз свае выказванні, праз адкрыццё свайго сэрца будзе ўзбагачаць іншых. Да гэтай часткі сустрэчы, як і да іншых, рыхтуемся праз чытанне дома тэксту, які прыгатаваны для кожнай сустрэчы. Мы чытаем тэкст асобна, а затым у сужэнстве абменьваемся думкамі аб ім, дыскутуем, шукаючы спосабы, якія дапамогуць вам зрабіць наступны крок да Бога.

Свае роздумы не пакідаем толькі для сябе. У форме, якая будзе агаворана ў наступнай сустрэчы, дасылаем іх да пілатуючай пары.

- ***Тэкст да абмену думкамі***



Кс. Анры Кафарэль, заснавальнік Equipes Notre-Dame (Суполак Маці Божай) у «Лісце да суполак» растлумачыў, якой павінна быць супольнасць сужэнстваў і які дух павінен панаваць пад час сустрэчы.

Штомесячныя сустрэчы суполкі не павінны вызначацца толькі яе складам, яе духам, сяброўствам яе членаў і іх імкненнем, каб гэта сустрэча была адным з этапаў у пошуках Бога. Трэба памятаць пра яе звышнатуральны памер і яе містэрыю, паколькі яна будзе сустрэчай не толькі людскіх істотаў. Тлумачыць нам гэта верш св. Мацвея: «*Бо дзе двое або трое сабраліся ў імя маё, там Я ёсць сярод іх*» (Мц 18,20). *«(...) сапраўды таксама кажу вам, што калі двое з вас на зямлі згодна прасілі б аб чым-небудзь, то станецца ім ад Айца Майго, які ў нябёсах»* (Мц 18,19).

Сярод прысутных сужэнстваў адчуваецца моцная прысутнасць Уваскрослага: жывога, які любіць кожнага такім, якім ён ёсць, з яго недахопамі і залежнасцямі; Ён спяшаецца дапамагчы нам стаць такімі, як Ён гэтага жадае. Ён прысутнічае так, як у Вячэрніку, калі раптоўна з'явіўся перад апосталамі. Звярнуўся да іх: «*Прыміце Духа Святога*». І яны сталіся новымі людзьмі. Езус Хрыстус не перастае ўдзяляць сужэнствам Духа Святога. Тыя, якія адкрываюцца на гэта – вучацца адкрывацца павольна – становяцца людзьмі Яго подыху. Тады сустрэча адбываецца пад апекай Святога Духа. Тым мужчынам і тым жанчынам, якія вечарам пасля цяжкага працоўнага дня прыходзяць стомленыя, заклапочаныя, гэты Дух удзяляе два прагненні Хрыста: Яго жаданне хвалы Айца і лагоднага спачування да тых простых людзей, якія «*нібы авечкі без пастыра*».

Кажу не аб тым, як заўсёды ёсць, але аб тым, як павінна быць і што мае стацца. Паколькі сустрэча суполкі, у якой няма намагання, каб супольна спаткаць Езуса Хрыста, з’яўляецца чым заўгодна, толькі не сустрэчай Equipes Notre-Dame.

Спаткаць Езуса Хрыста, гэта значыць найперш выслухаць Таго, аб якім мы знаем, што Ён ёсць з намі. Прамаўляе да нас праз Святое Пісанне – таму яго любім. Прамаўляе да нас праз навучанне Касцёла, апрацаванае на падставе Бібліі. Прамаўляе з глыбіні сэрца брата або сястры, але часта трэба разумець гэтыя словы нібы «з іншага боку». Падчас усей сустрэчы прамаўляе рознымі спосабамі, трэба ўмець «слухаць Яго сэрцам» – як кажа Святое Пісанне. Прамаўляе да кожнага патаемна, настаўляючы, каб мы адкрывалі Бога Айца і

Яго планы. Схіляе нас да ўнутранай перамены (перамены пастаяннай, якая ніколі не канчаецца), заахвочвае нас дапамагаць іншым людзям.

Ён прамаўляе, а мы маем уражанне, што ўсё гэта цяжка выканаць. Таму Езус не толькі заахвочвае, але перамяняе тых, якія прызнаюць сваё бяссілле, перадаючы ім Сілу Духа, якая ператварыла галілейскіх вяскоўцаў у нястомных сведкаў Збаўцы.

*Кс. А. Кафарэль* *(Ліст END, сакавік-красавік, 1973 г.)*

- ***Абмен думкамі на сустрэчы*** 

Зараз на спатканні ёсць час на абмен думкамі аб прачытаным тэксце. Прапануем адказаць на наступныя пытанні:

- Чаму мы тут? Чаго шукаем для сябе? Чаго чакаем ад суполкі? Якую ролю адыгрывае наша вера ў рашэнні ўдзельнічаць у сустрэчы?
- Ці абое, і муж і жонка, прыйшлі сюды з радасцю, зацікаўленыя Рухам? Ці можа вы напоўненыя перажываннямі, сумнівамі? Не бойцеся прызнацца ва ўсім, што адчуваеце. Суполка павінна абапірацца на праўду.
- Што мяркуем пра тэкст кс. Кафарэля? Што нам спадабалася, што нас уразіла? Чаму? Ці мы ўсведамляем прысутнасць Хрыста ў нашым сужэнстве?

***Заканчэнне сустрэчы***

На заканчэнне святар, духоўны дарадчык, благаслаўляе ўдзельнікаў.

 

**5. Заданне на час паміж сустрэчамі**

- Прачытаць матэрыял да другой сустрэчы, паразмаўляць у сужэнстве на прапанаваную ў тэксце тэму.
- Падрыхтавацца разам з сужонкам да дзялення жыццём.